# Віншаванні да Дня бібліятэк!



***Шаноўныя сябры!***

*Прыміце шчырыя віншаванні з прафесійным святам – Днём бібліятэк!*

*Кніга для чалавека – заўсёды верны сябар і мудры настаўнік, які дорыць магчымасць дакрануцца да культурнай спадчыны стагоддзяў, дапамагае знайсці адказы на многія пытанні. У сучасным грамадстве, дзе інфармацыя з'яўляецца рухаючай сілай, бібліятэкі, іх каштоўныя калекцыі і сучасныя інфармацыйныя рэсурсы набываюць усё большае значэнне.*

*Сёння бібліятэкі – гэта шматфункцыянальныя ўстановы, якія паспяхова выконваюць інфармацыйную, сацыякультурную, адукацыйную, камунікатыўную функцыі. Гэта месца, дзе чалавек вучыцца думаць і разважаць, дзе адбываецца сацыялізацыя асобы, яе далучэнне да культурных каштоўнасцяў. Бібліятэка – установа, дзейнасць якой традыцыйна садзейнічае падтрымцы, развіцці і папулярызацыі чытання.*

*Бібліятэчная справа ў Беларусі мае доўгую і багатую гісторыю, якая дае імпульс для развіцця ў сучасных умовах. У краіне дзейнічае шматгаліновая сетка, якая забяспечвае агульнадаступнасць бібліятэчных паслуг і рознабаковыя інфармацыйныя патрэбы насельніцтва. Сёння сістэма бібліятэк Беларусі ўключае каля 9,2 тысяч публічных і спецыяльных бібліятэк з агульным аб'ёмам фондаў звыш 200 мільёнаў экзэмпляраў.*

*Роля падзвіжніцкай і асветніцкай працы спецыялістаў бібліятэк відавочна. Сваёй нястомнай дзейнасцю вы захоўваеце культурную спадчыну Беларусі, актыўна ўдзельнічаеце ў працэсе фарміравання інфармацыйнага грамадства, выконваеце пачэсную місію выхавання інтэлектуальнай нацыі. Кожны жыхар нашай краіны ўдзячны вам за старанне і любоў да вашай карыснай справы.*

*Жадаю кожнаму з вас невычэрпнай крыніцы творчасці і духоўнай моцы, асабістага шчасця і поспехаў ва ўсіх галінах вашага жыцця! Няхай у гэтае свята вы ў найбольшай ступені адчуеце гонар за сваю справу, памножыце імкненне да далейшых дасягненняў, аптымізм і веру ў будучыню!*

Міністр культуры
Рэспублікі Беларусь

Б.У.Святлоў

Фота Юрыя Іванова

**Алена Далгаполава**





**Старшыня Савета Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, першы намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**

***Шаноўныя калегі!***

*Ужо трынаццаць гадоў у нашай краіне 15 верасня адзначаецца Дзень бібліятэк. Гэта свята – адна з найлепшых магчымасцей прыцягнуць увагу дзяржавы і грамадства да задач мадэрнізацыі і аднаўлення існуючай інфраструктуры бібліятэчнай галіны. Менавіта напярэдадні прафесійнага свята мы маем магчымасць больш актыўна кантактаваць з прадстаўнікамі ўлады і сродкамі масавай інфармацыі, весці сутнасны дыялог аб праблемах і перспектывах, якія стаяць перад бібліятэчнай супольнасцю. А яны вельмі складаныя і разнастайныя.*

*Беларусь сёння застаецца чытаючай краінай. Па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта на кожныя 1000 чалавек насельніцтва прыходзіцца 392 карыстальнікі публічных бібліятэк. Але ўсё часцей гучаць думкі аб тым, што ў век Інтэрнэта не патрэбны традыцыйныя чытальныя залы і абанементы. Скарачаюцца і рэарганізуюцца сеткі спецыяльных, школьных, сельскіх бібліятэк. Не так інтэнсіўна, як патрабуе час, укараняюцца і аднаўляюцца інфармацыйныя тэхналогіі. Даволі востра адчуваецца праблема папаўнення фондаў новай літаратурай. Пералік праблем можна доўжыць.*

*Ці трэба засяроджваць увагу на складанасцях у святочным звароце? Думаю, неабходна. Зберагчы патэнцыял і знайсці правільны вектар развіцця бібліятэчнай галіны дазволіць толькі ўдумлівае асэнсаванне сучасных рэалій, вылучэнне аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, якія ўплываюць на запатрабаванасць бібліятэк.*

*Сёння мы павінны не толькі задавальняць попыт карыстальнікаў на нашы паслугі, але і ўплываць на яго. У гэтым кірунку актуальным бачыцца развіццё сацыяльнага партнёрства з установамі адукацыі, замацаванне ўсведамлення ролі ведаў і інфармацыі ў сацыялізацыі асобы на розных этапах жыцця.*

*Патрабуюцца новыя акцэнты ў дыялогу бібліятэк з органамі ўлады і кіравання. Крытэрыі эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк павінны змяшчацца з колькасных паказчыкаў у бок якасных, а гэтыя змены адлюстроўвацца ў адпаведных нарматыўных актах.*

*Нашай прафесійнай супольнасцю шмат зроблена для замацавання сацыяльнага статусу бібліятэк, але яшчэ многа работы наперадзе. Яна патрабуе высокага прафесіяналізму, неабыякавага стаўлення да сваіх абавязкаў і актыўнай грамадскай пазіцыі.*

*Ад імя Савета Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі жадаю вам, шаноўныя калегі, творчага натхнення і карысных ідэй. Толькі актыўны пошук новага, выкарыстанне нетрадыцыйных падыходаў дазволяць нам стаць сапраўднымі культурнымі і інфармацыйнымі цэнтрамі. Тады мы не ўбачым у наш святочны дзень артыкулаў з загалоўкам «Когда библиотеки в Беларуси станут анахронизмом?», а будзем адзначаць урачыстасць з нашымі шматлікімі зацікаўленымі чытачамі.*

*Няхай вашай працы спрыяе добры настрой, моцнае здароўе, асабістае шчасце і дабрабыт.*